апублікаваны артыкулы па розных праблемах нац. мовазнаўства. Усё часцей пытанні бел. мовы рабіліся прадметам абмеркавання на Міжнар. з'ездах славістаў, разнастайных форумах лінгвістаў як у Беларусі, так і за мяжой. Аднак у 1970 — пач. 1980-х гг. бел. мова ўсё больш страчвала заваяваныя раней пазіцыі.

Дэмакратызацыя жыцця ў краіне з канца 1980-х гг., утварэнне суверэннай бел. дзяржавы (1991) з новай сілай абудзілі ў людзей цікавасць да гісторыі, культуры і мовы. Была распрацавана рэсп. праграма «Родная мова», створана *Таварыства беларускай мовы*, інш. грамадска-культ. арг-цыі. 14-я сесія Вярхоўнага Савета БССР (1990) прыняла закон «Аб мовах у Беларускай ССР» і вызначыла парадак ужывання бел., рус. і інш. моў у рэспубліцы. У адпаведнасці з гэтым законам бел. мова стала адзінай дзярж. мовай на тэр. Беларусі (паводле рэферэндума 1995 гэты статус нададзены і рус. мове). У вер. 1990 на аснове закона была прынята і «Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР».

Перыяд канца 20 — пач. 21 ст. ў развіцці бел. літ. мовы вызначаецца важнымі зрухамі ў яе лексічным складзе і сістэме словаўтварэння. Змены ў слоўнікавым складзе бел. мовы адбываюцца ў межах тэндэнцый да інтэрнацыяналізацыі і нацыяналізацыі. Ідзе інтэнсіўнае папаўненне яго іншамоўнымі запазычаннямі (пераважна англа-амерыканізмамі) тыпу «брэйк», «дылінг», «кілер», «маркет», «роўмінг», «шоў», «шопінг» і інш., вытворнымі адзінкамі з іншамоўнымі элементамі («дылерскі», «брэйк-данс», «брэйкер», «дэмпінгавы», «холдынг»). З другога боку, у актыўны ўжытак пачала ўводзіцца ўстарэлая і рэгіянальная лексіка тыпу «адсотак», «наклад», «улётка», «амбасада», «паліцыянт» і інш., побач з ужо існуючымі сталі выкарыстоўвацца новыя вытворныя лексічныя адзінкі: «аб'ядновец — аб'яднальнік», «авангардовы — авангардны», «бізнесменшчык, бізнесовец, бізнесоўца — бізнесмен» і інш.

Абнаўленне лексічнага складу мовы, змены фанетычнага, марфалагічнага і сінтаксічнага характару выклікалі неабходнасць удакладніць правапіс, прывесці яго ў адпаведнасць з сучаснай моўнай практыкай. Прыняты ў 2008 Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» накіраваны на стабілізацыю правапісных норм сучаснай бел. літ. мовы, забяспечвае захаванне адзінага рэжыму ў школьным навучанні і адзінства друкаваных беларускамоўных выданняў.

Сучасная бел. літ. мова здольна і павінна застацца рэальным сродкам зносін у грамадстве, важнейшай часткай бел. духоўнай нац. культуры.

*Літ.*: Карский Е.Ф. Белорусы: язык белорусского народа. Вып. 1—3. Минск, 1955—1956; Гапоненка І.А. Графіка і арфаграфія беларускіх выданняў XIX — пачатку XX стагоддзя. Мінск, 2002; Струкава С.М. Лексіка беларускай мовы: гісторыя і сучаснасць. Мінск, 2008; Прыгодзіч М.Р., Прыгодзіч А.А. Беларуская мова ў працах замежных лінгвістаў. Мінск, 2010; Лукашанец А.А. Беларуская мова: асаблівасці сучаснага стану і функцыянавання // Роднае слова. 2009. № 2.
М.Р.Прыгодзіч.

**ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ**, працэсы змянення культуры ў іх каштоўнасна-сэнсавым вымярэнні. Своеасаблівасць культуры Беларусі вызначаецца геапаліт. становішчам і гіст. лёсам краіны. Станаўленне бел. культуры адбывалася на стыку разнастайных культ. уплываў, у прыватнасці, зах.-еўрап. і рас. культур. У сваім гіст. развіцці бел. культура была вымушана весці барацьбу за нац. ідэнтычнасць; працэсы акультурацыі, культ. сінтэзу змяняліся асімілятарскімі тэндэнцыямі. Для бел. гісторыі характэрна цыклічнасць этапаў пад'ёму і заняпаду нац. культуры. Да тыпалагічных рысаў бел. культуры адносяцца традыцыйнасць, этнаграфічнасць, а таксама поліэтнічнасць і поліканфесійнасць.

Асн. крыніцы вывучэння ранніх этапаў развіцця бел. культуры — археал. матэрыялы, фалькл. тэксты, летапісы. Захаваліся фрагменты жытлаў, вырабаў, элементаў маст. культуры эпохі сярэдняга палеаліту. У пасляледавіковы перыяд (каля 10 тыс. гадоў таму назад) склаўся блізкі да сучаснага геагр. абрыс тэр. Беларусі, які паўплываў на этнічную культуру нашых продкаў. У старажытнасці на тэр. Беларусі жылі індаеўрап. плямёны, з якіх вылучыліся балцкія. У 6 ст. на бел. землі пачалі пранікаць слав. плямёны. Балта-слав. антрапалагічны і культ. сінтэз прывёў да фарміравання стараж.-бел. этнасу. У 8 ст. з'явіліся першыя формы дзяржаўнасці. З 10 ст. паводле летапісных звестак вядомы Полацкае, Смаленскае і Тураўскае княствы. Першапачаткова ўсх.-слав. культура развівалася як язычніцкая, з канца 10 ст. ў бел. княствах пачало ўсталёўвацца хрысціянства. У 992 засн. Полацкая епархія, у пач. 11 ст. — Тураўская. Пры манастырах ствараліся асветніцкія цэнтры. Адбывалася станаўленне хрысціянскіх традыцый у сямейным і грамадскім жыцці. На 11—12 ст. прыйшоўся росквіт раннефеадальнай культуры бел. княстваў. У дойлідстве дамінаваў раманскі стыль. Найб. значныя помнікі манумент. архітэктуры гэтага перыяду — Сафійскі сабор у Полацку (сярэдзіна 11 ст.), Спаскі сабор і Барысаглебская царква ў Гродне (12 ст.), Белая вежа ў Камянцы (канец 13 ст.). Узорамі стараж.-бел. рукапісных кніг (напісаны на царк.-слав. мове) з'яўляюцца Тураўскае і Рэймскае евангеллі (11 ст.), «Служэбнік» Валаама Худынскага (канец 12 ст. — пач. 13 ст.), Аршанскае евангелле (13 ст.). Славутым стараж.-рус. кніжнікам быў Клімент Смаляціч, выдатным царк. прамоўцам і пісьменнікам — Кірыла Тураўскі (13 ст.).

У 13—15 ст. ішлі працэсы станаўлення бел. народнасці, нац. дзяржаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

насці, бел. мовы, самабытных форм бел. абарончай архітэктуры (Навагрудскі, Лідскі замкі), царк. жывапісу і музыкі, л-ры, адбываўся сінтэз мясц. культ. традыцый і зах.-еўрап. культуры. З 15 ст. фарміраваўся бел. тып рэнесанснай культуры, праходзіла станаўленне сучаснай бел. мовы, л-ры, тэатр., муз. і інш. мастацтваў. Дасягненнямі тагачаснай бел. культуры з'явіліся заснаванае Ф.Скарынам кнігадрукаванне, паэт. творчасць Міколы Гусоўскага, Я.Вісліцкага, А.Рымшы, тэолага-асветніцкая дзейнасць С.Буднага, В.Цяпінскага, станаўленне традыцый красамоўя і паэтыкі ў творах Л.Зізанія і М.Сматрыцкага, Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588.

У пераходны ад эпохі Адраджэння да культуры барока перыяд афармілася творчасць Сімяона Полацкага і новалац. польск. паэта М.Сарбеўскага. Да твораў позняга барока адносяцца ансамблі грамадзянскай архітэктуры і помнікі драўлянага дойлідства 2-й пал. 17 — пач. 19 ст. У 17 ст. актывізавалася развіццё свецкай філасофіі і сістэмы адукацыі (езуіцкія калегіумы, брацкія школы), кнігадрукавання, царк. і свецкай паэзіі, партрэтнага жывапісу, драўлянай скульптуры і кніжнай графікі, тэатр. мастацтва і музыкі. З канца 17 ст. пачалася паланізацыя шляхты, школьнай адукацыі, друку. Паводле гіст. і літ. крыніц, да канца 17 ст. мовай дзярж. справаводства заставалася беларуская, якая ў 2-й пал. 17—18 ст. паступова выцяснялася польскай і лацінскай. Ананімныя творы 17—18 ст. («Ліст да Абуховіча», парадыйнага і сатыр. зместу — зб-кі «Птушыны баль», «Ваенны паход грыбоў», «Пра баляванне вераб'я») напісаны бел. мовай.

Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772—1795) і задушэння паўстанняў 1830—31 і 1863—64 узмацніўся ўплыў на бел. культуру рус. культуры. Творчыя дасягненні бел. народа выяўляліся ў фальклоры, нар. тэатры, дойлідстве, дэкар.-прыкладным мастацтве, традыц. абрадавай культуры. Старабел. літ.-культ. традыцыя стала падмуркам нац. адраджэння 19 ст. Адбывалася станаўленне новай бел. л-ры (ананімныя паэмы «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе», творчасць П.Багрыма, Я.Чачота, Я.Баршчэўскага, В.Дуніна-Марцінкевіча, Р.Падбярэскага, А.Рыпінскага, А.Вярыгі-Дарэўскага), нац. тэатра, нац. выяўл. мастацтва (К.Русецкі, І.Хруцкі, Н.Орда, К.Альхімовіч, М.Сільвановіч, Ф.Рушчыц). Развіваліся бел. нац. свядомасць, цікавасць да гіст. спадчыны бел. народа, фарміраваліся ідэі аднаўлення бел. дзяржаўнасці і росквіту нац. культуры, народніцкі рух (Бел. сацыяліст. грамада), рэв.-дэмакр. думка (Ф.Багушэвіч, А.Гурыновіч, К.Каганец). Пачалося даследаванне нар. побыту і культуры беларусаў (У.Дабравольскі, М.Доўнар-Запольскі, А.Кіркор, І.Насовіч, М.Нікіфароўскі, Е.Раманаў, А.Сержпутоўскі, П.Шпілеўскі, Я.Карскі). У перыяд пасля рэвалюцыі 1905—07 пачала фарміравацца бел. класічная л-ра (Я.Купала, Я.Колас, Цётка, М.Багдановіч, А.Гарун, З.Бядуля), складацца сучасная бел. літ. мова, нац. друк і кнігавыданне (газ. «Наша доля», «Наша ніва», «Беларусь», «Гоман», час. «Лучынка», «Саха», альманах «Маладая Беларусь», выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца»), нац. тэатр (Першая бел. трупа Ігната Буйніцкага, Першае бел. т-ва драмы і камедыі). Развіваліся даследаванні па гісторыі Беларусі (В.Ластоўскі) і нац. л-ры (М.Гарэцкі). Пачаўся працэс будаўніцтва нац. дзяржавы (БНР, БССР), стварэння бел. школы і друку (газ. «Вольная Беларусь», «Беларускі шлях», «Беларусь», час. «Беларускае жыццё»). У 1920-я гг. ў Сав. Беларусі праходзіў працэс беларусізацыі, складалася сістэма нар. адукацыі з бел. мовай навучання, ствараліся Ін-т бел. культуры, АН БССР, адкрыўся БДУ і інш. вышэйшыя і сярэднія навуч. ўстановы. Развіваліся бел. літ. мова, творчасць бел. літаратараў (літ.-маст. аб'яднанні «Маладняк», «Полымя», «Узвышша»), бел. тэатр (Бел. тэатр імя Янкі Купалы, Бел. тэатр імя Якуба Коласа, Бел. трэці дзярж. тэатр), выяўл. мастацтва, музыка, кінематограф, архітэктура. У 1927—29 узмацніўся ідэалагічны ціск на бел. навук., культ-асветную і літ.-маст. інтэлігенцыю, усе сферы грамадска-паліт. жыцця. Згортванне беларусізацыі перарасло ў рэпрэсіі 1930-х гг., у выніку якіх значныя страты зазналі АН БССР, культ.-асвет. ўстановы, літ-маст. арг-цыі. Традыцыі бел. культ.-нац. адраджэння развіваліся ў 1920—30-я гг. ў Зах. Беларусі. Філас. абгрунтаванне гэтага руху ўвасобілася ў эсэ І.Канчэўскага «Адвечным шляхам: даследзіны беларускага светагляду». Развіццю бел. нац. культуры спрыяла стварэнне Т-ва бел. школы, Бел. сялянска-работніцкай грамады. Важнае значэнне мела дзейнасць А.Луцкевіча, Б.Тарашкевіча, С.Рак-Міхайлоўскага, П.Мятлы, П.Валошына, развіццё зах.-бел. перыяд. друку (газ. «Беларуская доля», «Беларуская ніва», «Беларускі звон», час. «Калоссе», «Маладняк», «Родныя гоні»).

У перыяд Вял. Айч. вайны прадстаўнікі бел. культуры ўключаліся ў барацьбу з ворагам. Многія з іх стваралі творы героіка-патрыятычнай тэматыкі падчас знаходжання на фронце, у партызанах, у эвакуацыі. У гэтых творах адлюстраваны героіка і пакуты вайны, услаўлена мужнасць бел. народа. Перамога над ням.-фаш. захопнікамі выклікала ўздым нац. свядомасці. Аднаўляліся адукацыя і друк на роднай мове, ажыўляліся літ. і навук. традыцыі, маст. творчасць.

У канцы 1950-х гг. адбываўся зварот да нац. гіст., літ. і маст. традыцый, былі апублікаваны творы рэпрэсіраваных пісьменнікаў. Развіваліся школы бел. тэатр., муз., выяўл. мастацтва. У 1960—80-я гг. бел. вучоныя засяродзіліся на даследаванні нац. культ. спадчыны. Падрыхтаваны цыкл манаграфій, энцыклапедычных даследчых выданняў, прысвечаных гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бел. л-ры і мастацтва, гісторыі філасофіі Беларусі. Адкрыліся Музей стараж.-бел. культуры пры Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, Бел. дзярж. музей нар. архітэктуры і побыту, інш. музейныя і культ.-асветныя ўстановы. На новым этапе гісторыі бел. культуры важнае значэнне мела прыняцце Закона БССР аб мовах (1990), стварэнне Т-ва бел. мовы імя Ф.Скарыны. На базе гуманітарных ін-таў НАН Беларусі, БДУ, Бел. пед. ўн-та імя М.Танка, Бел. ун-та культуры і мастацтваў і інш. ВНУ, Міжнар. асацыяцыі беларусістаў праводзяцца разнапланавыя даследаванні нац. бел. культуры. Важнае значэнне набывае ўключэнне бел. гіст.-культ. традыцый у сучасны сацыякульт. кантэкст.

*Літ.*: Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1—3. Мінск, 1983—87; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Т. 1—7. Мінск, 1984—88; Этнаграфія Беларусі. Мінск, 1989; Археалогія і нумізматыка Беларусі. Мінск, 1993; Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 3. Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне. Мінск, 1994; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1—2. Мінск, 1994—95; Лыч Л.М., Навіцкі У.І. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, 1996; Очерки истории науки и культуры Беларуси IX — начала XX в. Минск, 1996; Лазука Б.А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1—2. Мінск, 2007; Археалогія Беларусі. Т. 1—2. Мінск, 2009—10; Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 1—2. Мінск, 2009—10.

*В.Р.Языковіч.*

**ГІСТОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ**, раздзел *літаратуразнаўства* (побач з тэорыяй і метадалогіяй л-ры, літ. крытыкай), які вывучае л-ру як працэс: важнейшыя эвалюцыйныя заканамернасці і тэндэнцыі, звязаныя з заканамернасцямі развіцця грамадства ў пэўныя эпохі, узнікненне, змену літ. плыней, станаўленне, характарыстычныя рысы творчых метадаў і маст. стыляў, месца пісьменніка і асобных твораў у літ. працэсе. Г.л. сістэматызуе канкрэтныя маст. з'явы. Сусветная л-ра складаецца з нац. л-р, якія маюць свае асаблівасці, абумоўленыя менталітэтам, традыцыямі, гіст. лёсам народа. Гісторыя нац. л-ры займаецца аўтаразнаўствам (напр., купалазнаўства, коласазнаўства), вывучэннем рэгіянальных нац. л-р, л-р блізкага і далёкага замежжа. У гісторыі бел. мастацтва слова вылучаюць некалькі працяглых па часе перыядаў: даўняя (стараж.) л-ра (11 — 1-я пал. 18 ст.), новая (2-я пал. 18 — 19 ст.) і найноўшая (20—21 ст.). Гісторыя бел. нац. л-ры пачала складвацца ў 1-й пал. 19 ст., але яе сістэматычнае вывучэнне пачалося толькі ў пач. 20 ст. (працы М.Багдановіча, Л.Гмырака, Я.Карскага, С.Палуяна, пазней Я.Барычэўскага і інш.). Першае спец. даследаванне па праблемах гісторыі развіцця бел. л-ры — «Гісторыя беларускае літаратуры» М.Гарэцкага (1920), сярод сучасных прац — «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» (т. 1—4, 1999—2003), «Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў» (т. 1—2, 2007).

*Т.К.Грамадчанка.*

**ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВАЎ**, раздзел *мастацтвазнаўства*, які даследуе працэс развіцця мастацтва ад яго ўзнікнення да нашага часу, развіццё мастацтва асобных краін або эпох, аналізуе эвалюцыю відаў, жанраў мастацтва, узнікненне, развіццё і змену маст. кірункаў, стыляў, творчасць мастакоў і маст. крытыкаў, а таксама канкрэтныя маст. творы. Развіццё мастацтва ў кожнай краіне непарыўна звязана з гісторыяй яе народа і адрозніваецца нац. асаблівасцю. На тэр. Беларусі даследаванні па Г.м. вядуцца з канца 18 ст. Мэтанакіравана і сістэматычна вывучэнне Г.м. пачалося са стварэннем бел. дзяржаўнасці. Сабраны багаты матэрыял па мастацтву асобных перыядаў, зроблены археал. адкрыцці, выяўлена шмат твораў мастакоў старажытнасці, адкрыты новыя імёны мастакоў, створаны значныя абагульняльныя працы па Г.м. У 1920-я гг. вял. ролю ў гэтым адыграў Ін-т бел. культуры (Інбелкульт), у сістэме якога працаваў Ін-т бел. мастацтва. Даследаванні ў галіне бел. мастацтва праводзілі М.Шчакаціхін, М.Бруноў, М.Каспяровіч, І.Гаўрыс, І.Хозераў, А.Ляўданскі, А.Някрасаў, І.Фурман, С.Бяссонаў, С.Шыраеў і інш. Характарыстыка асн. этапаў развіцця бел. мастацтва творчасці вядучых майстроў зроблена калектывам аўтараў у зб-ках «Нарысы па гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі» і «Мастацтва Савецкай Беларусі» (абодва 1940). Пасля Вял. Айч. вайны вывучэнне Г.м. стала планамерным і мэтанакіраваным. Вялося шырокае архіт.-археал. даследаванне стараж. гарадоў: Мінска, Полацка, Віцебска, Брэста, Гродна, Турава (Жыткавіцкі р-н), Пінска, Ваўкавыска, Навагрудка, Лукомля, Слуцка, Клецка, Заслаўя (Мінскі р-н), Лагойска, Крычава, Чачэрска, Слоніма, Давыд-Гарадка (Столінскі р-н) і інш. (В.Тарасенка, Г.Штыхаў, Я.Звяруга, Э.Загарульскі, П.Лысенка, М.Ткачоў, Г.Пех, Б.Міралюбаў і інш.). Развіццю архіт. навукі Беларусі ў сярэдзіне 20 ст. садзейнічала работа па комплексным даследванні горадабудаўніцтва, выдатных помнікаў бел. дойлідства (Ю.Ягораў, М.Кацар, М.Асмалоўскі, А.Кулагін, Ю.Якімовіч, А.Воінаў, У.Чантурыя).

Выяўл. і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, творчасць асобных мастакоў даследуюць В.Шматаў, Л.Дробаў, П.Масленікаў, М.Арлова, Н.Высоцкая, І.Ялатамцава, А.Лявонава, Я.Сахута, М.Яніцкая і інш.

Выдадзена «Гісторыя мастацтваў народаў СССР» (т. 3—8, 1972—81), Ін-там мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі падрыхтаваны і выдадзены «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (т. 1—7, 1984—88), «Гісторыя беларускага мастацтва» (т. 1—6, 1984—94). Матэрыялы па Г.м. публікуюцца ў часопісе «Мастацтва», альманаху «Запіскі Дзяржаўнай акадэміі мастацтваў» і інш. Сістэматычнае вывучэнне Г.м. і архітэктуры Беларусі вядзецца ў Ін-це мастацтвазнаўства, этнагра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ